## ПАВЕЙ, ВЕТРЫК, ПАВЕЙ

*Беларуская народная песня*

*Для альта, тэнару і змешанага хору*

Апрацоўка П. Падкавырава







_ма чым звя_за_ці, да_лё_ка мой мі_лы, ка_го мне пас_ла_ці? Ах!
Мм...
Аа...
Звя_жы ты га_лоў_ку шаў_ко_вым пла_точ_кам, паш_
Аа...
Аа...
Ля_
_лі па мі_ло_га сі_вым га_лу_боч_кам.
Аа... Сі_вым га_лу_боч_кам.
Мм...
Сі_вым га_лу_боч_кам.




_ці, го_луб сі_вы, на_зад ва_ра_ці_ся. З кім мі_лы гу_ля_е, ты
Мм...
Мм...
Мм...
мне пах_ва_лі_ся.
Ля_цеў го_луб сі_вы з вы_со_ка_га га_ю, пры
Жы_вы_я, га_луб_ка
_нёс ёй ліс_то_чак з да_лё_ка_га кра_ю. Пры_нёс ліс_




## ПАВЕЙ, ВЕТРЫК, ПАВЕЙ

Павей, ветрык, павей
З высокага гаю,
Прыедзь, мой міленькі,
З далёкага краю.

Ой, цяжка павеяць,
Калі гай высокі,
Ой, цяжка прыехаць,
Калі край далёкі.

Баліць мне галоўка,
Няма чым звязаці.
Далёка мой мілы,
Каго мне паслаці?

Звяжы ты галоўку
Шаўковым платочкам,
Пашлі па мілога
Сівым галубочкам.

Ляці, голуб сівы,
Назад вараціся.
З кім мілы гуляе
Ты мне пахваліся.

Ляцеў голуб сівы
З высокага гаю,
Прынёс ёй лісточак
З далёкага краю.

Жывы я, галубка
Мая дарагая,
За слёзы і гора
Знішчу ворага я.